3. Сухих, Л.В. Роль алгоритмов в повышении практической грамотности / Л.В. Сухих. – М. : Первое сентября, 2009. – 78 с.
4. Лаури, Н.М. Алгоритмы по орфографии / Н.М. Лаури // РЯШ. – 2009. – № 4. – С. 26–32.
5. Лисовская, И.М. Алгоритмы применения правил на уроках языка при изучении правописания в 5–7 классах / И. М. Лисовская. – Мозырь : Белый Ветер, 2008. – 40 с.
6. Беспалько, В.П. Слагаемые педагогической технологии / В.П. Беспалько. – М. : Педагогика, 1989.

## ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ ІДЭІ СЛУЖЭННЯ Ў ПЕДАГАГІЧНАЙ ДУМЦЫ БЕЛАРУСІ XIV–XVII СТСТ.

**М. М. Шчэрбін, В. С. Старжынская**
УА МДПУ імя І. П. Шамякіна (Мазыр)

Служэнне інтарэсам сваёй зямлі, свайго народа і сваёй краіны – заўсёды пазіцыянавалася як галоўны абавязак чалавека-патрыёта і чалавека-грамадзяніна. Аднак інтэпрэтацыя грамадзянска-патрыятычнага служэння ў пэўных гістарычных абставінах магла мець рознае ўвасабленне. Гэта было звязана як з эвалюцыяй змястоўнага скаладальніка выхаваўчага працэсу ў цэлым, так і са зменамі сацыякультурнага асяроддзя. Пры гэтым асабіста якаснае праяўленне такога служэння мела цесную сувязь са светапоглядным імкненнем нашых продкаў да міру і згоды.

На працягу XIV–XVII стст. ідэя служэння ў педагагічнай думцы Беларусі знайшла адлюстраванне ў калектыўных формах грамадска карыснай дзейнасці. Важнай якасцю зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання XIV–XV стст. з'ўлялася супадпарадкаванне асабістых інтарэсаў грамадскім. Адзначаная якасць выступала адлюстраваннем імкнення да справядлівых асноў быцця, прававога пачатаку дзяржаўных адносін. На працягу даследуемага перыяду вылучаная якасць знайшла адлюстраванне ў двух аспектах: на ўзроўні асобасна-свядомасным – праз апеляцыю да хрысціянскага сумлення і традыцый супольнай жыццядзейнасці, на ўзроўні грамадскім – у актуалізацыі развіцця прапісанага права.

Заснаванае на моцным духоўна-рэлігійным падмурку супадпарадкаванне асабістых інтарэсаў грамадскім мела важнае значэнне з пункту гледжання захавання міру ва ўмовах феадальнага грамадства. Пры адсутнасці шырока распаўсюджаных прапісаных нормаў на працягу XIV–XV стст. апеляцыя да сумлення, маральнага абавязку асобы з'яўлялася дзейсным сродкам выхавання індывіда, садзейнічала фарміраванню здольнасцей рэгулявання сваіх дзеянняў адносна іншых людзей, уменняў паставіць на першае месца не асабістыя інтарэсы, а ўсеагульнае дабро і згоду.

У той жа час фларылегіі, спасылаючыся на старажытных філосафаў, адзначалі, што добра жывуць у тым горадзе, "в котором живут по закону, а несправедливых карают" [6, с. 480]. Для старажытных крыніц характэрны зварот да закону як крыніцы грамадскай справядлівасці, а таму натуральным з'яўлялася імкненне да зацвярджэння прыярытэту права праз выхаванне паважлівых адносін да яго. "Больных спасают врачи, обиженных – закон", –

МГПУ им. И.П. Шамякина

пераконвалі філосафы аб вядучай ролі існавання права для краіны і народа [3, с. 252]. Па гэтай прычыне фарміраванне прыхільнасці да права сярод маладога пакалення з'яўлялася важнай перспектыўнай задачай ў XIV–XV стст., што знайшло адлюстраванне ў педагагічнай думцы адзначанага перыяду.

Акрэсленыя абставіны абумовілі маральна-этычную аснову супадпарадкавання асабістых інтарэсаў грамадскім як грамадзянска-патрыятычнай якасці, што абапіралася і на маральны абавязак як сістэму вышэйшых каштоўнасцей, і на прававы пачатак. Прычым гістарычныя вытокі такой практыкі былі настолькі трывалымі і эфектыўнымі, што нават з развіццём прававой сістэмы на беларускіх землях на працягу XVI ст. сінтэз духоўна-маральных і прававых кампанентаў адрозніваў змест грамадзянска-патрыятычнага выхавання маладых пакаленняў у далейшым.

Ва ўмовах актыўнага развіцця дзяржаўна-прававой сістэмы адной з важнейшых грамадзянска-патрыятычных якасцей з'яўлялася добрасумленнае выкананне грамадскіх абавязкаў. Абавязак, як этыка-палітычная катэгорыя звязаны з выкананнем пэўных дзеянняў, што маюць "канкрэтныя сацыяльна-эканамічныя і палітычныя ўмовы ўвасаблення" [1, с. 33]. На працягу XVI ст. акрэсленыя формы сталі асновай асэнсавання грамадскага абавязку праз яго суаднясенне з правам і законнасцю, актыўнай грамадска карыснай працай па ўпарадкаванні і ўдасканаленні грамадства і дзяржавы. І калі распаўсюджванне прапісанага права мела пэўную саслоўную абмежаванасць, то выкананне сваіх непасрэдных абавязкаў згодна з саслоўнай стратыфікацыяй пазіцыяніравалася як значны фактар грамадскай стабільнасці, важная якасць чалавека-патрыёта і чалавека-грамадзяніна.

Сцвярджэннем неабходнасці ажыццяўлення прызначэння чалавечага жыцця праз яго грамадскую рэалізацыю адрозніваліся погляды Ф. Скарыны. Гуманіст быў упэўнены, што кожны чалавек павінен "…в добрых делах и в любви отчины … всякого тружения и скарбов для посполитого доброго и для отчины своея не лютовати" [2, с. 27]. На ўласным прыкладзе Ф. Скарына прадэманстраваў, як трэба "жити в добрых обычаях, в спалучении веры, помогаючи друг другу со всякою любовью ..." [2, с. 22]. Для першадрукара служэнне ўсім "людем посполитым", "незалежна ад сацыяльнай і рэлігійна-канфесійнай прыналежнасці" і ёсць сэнс жыцця сапраўднага чалавека-патрыёта і грамадзяніна [2, с. 43].

Добрасумленнае выкананне свайго грамадскага абавязку з'яўлялася вяршыняй чалавечых дабрачыннасцей, на думку А. Волана. Увасабленнем дадзенай дабрачыннасці асветнік называў патрыятычную адданасць, калі "…самым мудрым и достойным большой похвалы является тот, кто для блага Родины, для благополучия и процветания государства без колебаний идет навстречу и сознательно подвергает себя самому большому и самому опасному риску" [2, с. 292]. Разам з тым, у творах А. Волана разглядаецца катэгорыя грамадзянскага доўгу, якая рэалізоўвалася ў служэнні сваёй Радзіме і грунтавалася на маральна-прававой аснове. Такое спалучэнне было абумоўлена цеснай пераемнай сувяззю рэлігійнай этыкі Сярэднявечча з гуманістычна-рэфармацыйнымі ідэямі ажыццяўлення грамад-

МГПУ им. И.П. Шамякина

скага прызначэння жыцця чалавека ў XVI ст. Прававед вызначыў у якасці “свяшчэннага доўгу і ганаровага абавязку – рупліва і аддана захоўваць і абараняць яе (дзяржавы) дабрабыт” [2, с. 278]. Па сутнасці, філосаф надаваў прыярытэт грамадзянска-патрыятычнай адданасці як аснове грамадзянскага доўгу чалавека. Менавіта паводле “сумленнага выканання абавязкаў”, захавання правоў і свабод адрозніваў прававед сапраўдных “грамадзян” [2, с. 279]. Сцвярджэнне прававой асновы грамадзянска-патрыятычных якасцей з’яўлялася прагрэсіўнай з’явай свайго часу і абумовіла актывізацыю грамадзянска-прававога вектара зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў XVI ст.

Значнай грамадзянска-патрыятычнай якасцю асобы ў канцы XVI–XVII стст. выступаў прыярытэт грамадзянска-патрыятычнага служэння. Калі грамадска-педагагічнай і філасофскай думкай неабходнасць служэння асобы сваёй краіне прызнавалася яшчэ ў XVI ст., то для літаратуры рэлігійнага зместу была ўласціва пэўная абмежаванасць грамадскіх форм дзейнасці, абумоўленая канфесійнымі перакананнямі. Аднак шырокамаштабная палеміка, якая разгарнулася ў канцы XVI–XVII стст., садзейнічала пошуку магчымасцей грамадскага ўвасаблення рэлігійных абавязкаў.

Эвалюцыя поглядаў адносна грамадскага служэння была характэрна для праваслаўных палемістаў, якія галоўнай мэтай жыцця веруючага чалавека яшчэ з часоў Кіеўскай Русі вызначалі прысвячэнне сябе Богу праз аскетычны лад жыцця. У сацыякультурных абставінах канца XVI–XVII стст. надзённым выступае погляд аб неабходнасці грамадскай рэалізацыі веруючага чалавека праз прынясенне карысці свайму народу, абарону інтарэсаў сваёй краіны. Разам з рэлігійнымі дабрачыннасцямі служэнне не толькі Богу, але і грамадству, дзяржаве прызнавалася ключавым абавязкам чалавека. Ідэалы грамадзянска-патрыятычнага служэння выступаюць у даследуемы час прыкладам ажыццяўлення запаведзяў Божых: любові, міласэрнасці, спагадлівасці ў адносінах да іншых. Так, вядомы багаслоў К. Стаўравецкі разам з прызнаннем значнасці маральнага ўдасканалення чалавека адзначаў важнасць грамадзянскіх дабрачыннасцей і трывалых дзяржаўных асноў [5, с. 118]. У сувязі з гэтым у канцы XVI–XVII стст. “шанаванне чалавека ў грамадстве ставілася вышэй, чым пустэльніцкае жыццё аскета”, што абумовіла запатрабаванасць грамадзянска-патрыятычнага служэння ў выхаванні асобы [4, с. 18].

Пры гэтым праяўленне грамадзянска-патрыятычнага служэння як асобаснай якасці ў канцы XVI–XVII стст. грунтавалася на неабходнасці будаваць дыялог на аснове цярпімасці, абапірацца ў сваёй дзейнасці на прынцып роўнасці з іншымі канфесіямі, што стала адметнай формай патрыятызму праваслаўных палемістаў, арыентаваных на грамадскі мір і цэласнасць краіны.

Каталіцкія палемісты таксама сцвярджалі неабходнасць давядзення сваіх здольнасцей да дасканаласці “для достижения святости своей жизни и для апостольского служения”, што прадугледжвала ўдзел у дзяржаўным жыцці, праяўленне сябе ў розных грамадскіх сферах [7, с. 202]. Найбольшых поспехаў у ажыццяўленні гэтай мэты дасягнулі езуіты, дзякуючы перш за ўсё прадуманай сістэме адукацыі, што мела бясплатную аснову і адсутнасць

МГПУ им. И.П. Шамякина

сацыяльных абмежаванняў. У якасці адной з важнейшых адукацыйных задач езуіты адзначалі неабходнасць "воспитывать граждан, переполненных любви к своему Отечеству, верных своему монарху и способных выполнять с честью все доверенные им должности" [1, с. 34]. Але трэба мець на ўвазе існаванне вышэйшай мэты, якой павінны садзейнічаць усе, хто падпарадкуецца Ватыкану, – пашырэнне каталіцтва. Пры выкананні гэтай умовы грамадзянска-патрыятычнае служэнне асобы як важная якасць зместу выхавання патрыёта і грамадзяніна атрымала ўсхваленне і падтрымку католікаў у канцы XVI–XVII стст.

Уніяцкія палемісты ўвасабленнем адданага служэння краіне лічылі вырашэнне рэлігійнага пытання праз паступовы пераход да уніі. Менавіта дамоўленасць на ўзроўні веры ў межах полікультурнага грамадства Рэчы Паспалітай разглядалася гарантам адзінства і дабрабыту для краіны, паводле ўніяцкіх перакананняў. З гэтай нагоды, напрыклад, Базыліянскі ордэн у адпаведнасці з зацверджаным уставам "сочетал аскетический уклад жизни и светскую деятельность" [5, с. 60]. Царкоўнае адзінства, што абапіраецца на "натуральные права народов", на думку М. Сматрыцкага, з'яўляецца крыніцай дабра для ўсіх людзей [2, с. 12]. Па гэтай прычыне аснову грамадзянска-патрыятычнага служэння веруючага чалавека, паводле ўніяцкіх аўтараў, павінна складаць спалучэнне рэлігійных дабрачыннасцей і грамадскай дзейнасці па ўпарадкаванні уніі, што знайшло адлюстраванне ў змесце грамадзянска-патрыятычнага выхавання ў канцы XVI–XVII стст.

Менавіта з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй асобы звязвалі росквіт Радзімы і грамадскія дзеячы: "…Где расторопность в прадедах, справедливость в судех, // Где статечностью во всяких для Отчызны трудех, // Там Бог благословляет, там слава значная" [2, с. 300].

Такім чынам, ідэя служэння ў педагагічнай думцы Беларусі XIV–XVII стст. мела выключнае значэнне. Яе рэалізацыя разглядалася праз якасныя характарыстыкі і прызначэнне чалавека-патрыёта і чалавека-грамадзяніна, а напаўненне мела цесную ўзаемасувязь з канкрэтна гістарычнымі абставінамі. Інтэрпрэтацыя ўвасаблення служэння грунтавалася на ключавых каштоўнасных дамінантах хрысціянскай і народна-педагагічнай культуры Сярэднявечча, развівалася пад уплывам распаўсюджвання рэнесансна-рэфармацыйных ідэй і эвалюцыі дзяржаўна-прававой сістэмы ВКЛ, узмацненне грамадзянска-прававога вектара фарміравання зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання і інтэнсіфікацыю яго талерантна-канфесійных і гуманістычных асноў.

**Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры**

1. Вішнеўская, Л.В. Грамадзянская актыўнасць як састаўляючая грамадзянскага выхавання / Л.В. Вішнеўская. – Мінск : Энцыклапедыкс, 2006. – 80 с.

2. История общественной и философской мысли Беларуси: Раннее и развитое Возрождение : хрестоматия : пособие / авт.-сост. В.В. Старостенко. – Могилев : УО «МГУ им. А. А. Кулешова», 2010. – 332 с.: ил.

3. История общественной и философской мысли в Беларуси: эпоха Средневековья: хрестоматия : пособие / авт.-сост. В.В. Старостенко. – Могилев : УО «МГУ им. А.А. Кулешова», 2009. – 396 с.

МГПУ им. И.П. Шамякина

4. Кутузова, Н.А. Нация, религия и государственность в полемической литературе Беларуси конца XVI – первой половины XVII вв. / Н.А. Кутузова. – Минск : Право и экономика, 1998. – 93 с.
5. Памятники полемической литературы в Западной Руси. – Пб., 1882. – Кн. 2 (Русская историческая библиотека. Т. 7). – 918 с.
6. Пчела // Памятники литературы Древней Руси: XIII век / вступ. статья Д.С. Лихачева ; общ. ред. Л.А. Дмитриева и Д.С. Лихачева. – М. : Худож. лит., 1981. – С. 474–486.
7. Скарга, П. О единстве церкви Божіей / П. Скарга // Русская Историческая Библиотека. – Т. 19, кн. 3. – С. 193–279.

## СУЩНОСТНЫЕ ОСНОВЫ ФЕНОМЕНА ГРАЖДАНСТВЕННОСТИ В ПЕДАГОГИЧЕКИХ ИССЛЕДОВАНИЯХ

**С. В. Ясечко**
УО МГПУ им. И.П. Шамякина (г. Мозырь)

МГПУ им. И.П. Шамякина

В современных реалиях белорусского общества и системы образования в частности одним из значимых объектов внимания выступает феномен гражданственности. Его приоритетность отражена в Концепции непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи, Программе непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи на 2021–2025 гг., Программе патриотического воспитания населения Республики Беларусь на 2022–2025 г. и в других нормативно-правовых актах, которые определяют государственную политику в области образования. Так в Концепции непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи гражданственность трактуется как интегративное качество личности, ориентированное на достойное, ответственное и социально значимое исполнение социальных ролей [5, с. 10].

Феномен гражданственности находится в фокусе внимания таких наук как психология, социология, философия, правоведение, политология. Интересным представляется анализ идеи гражданственности как феномена педагогических исследований, где гражданственность рассматривается в плоскости схожих категорий и личностно-ориентированных качеств.

Сложность истолкования понятия «гражданственность», разнообразие ее определений, трактовок к исследованию проблемы гражданственности как феномена педагогических исследований возникает по ряду причин. Одна из причин состоит в разносторонности, многоаспектности указанной формы общественной самоорганизации, в смежности с другими близкими по смысловому значению категориями, например, гражданин, гражданское воспитание, гражданское общество и другими. Другая причина сложности связана с многочисленными трактовками гражданственности, сформировавшимися в западной социально-философской мысли на протяжении длительного периода.

Исследование феномена гражданственности не представляется возможным без уточнения таких схожих во многом категорий, как гражданин, гражданское воспитание, гражданское общество, гражданское самосознание. Трактовка «гражданственности» сложная многогранная категория, в которой переплетается очень многое. В нее включают соблюдение установленных